Рэалізацыі дадзенай мэты імкнуліся дасягнуць рознымі **сродкамі**, асноўнымі сярод якіх з'яўляліся наступныя:

• *палітычныя*: дыпламатыя. На практыцы прымяняліся наступныя метады яе рэалізацыі: пасольскія візіты, перамовы, падрыхтоўка і заключэнне ў асноўным двухбаковых пагадненняў, дыпламатычная перапіска і г. д.;

• *ідэалагічныя сродкі*: важнейшым сярод якіх з'яўляецца знешнепалітычная прапаганда;

• *ваенныя сродкі*: ваенныя сілы ВКЛ у дадзеным выпадку выкарыстоўваліся ў асноўным як сродак стрымлівання агрэсіўных памкненняў іншых дзяржаў.

Нягледзячы на тое, што знешняя палітыка ВКЛ была актыўнай на ўсіх асноўных накірунках, гэта мэта дасягнута не была: тэрытарыяльныя страты не ліквідаваны, быў нанесены значны удар па міжнародным прэстыжы Княства. Выправіць гэтыя пралікі трэба было як мага хутчэй. Але, як паказалі далейшыя падзеі, аднавіць былую веліч Вялікаму княству Літоўскаму ўжо не ўдасца.

[1] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 5. Вильнюс, 1993. С. 134–136; Сборник Русского исторического общества (далей – Сб. РИО). СПб., 1882. Т. 35. С. 125–129.
[2] Гл.: Там жа. С. 64; Сб. РИО. Т. 35. С. 81.
[3] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 5. С. 180–181; Сб. РИО. СПб., 1884. Т. 41. С. 417–422.
[4] Гл.: Сб. РИО. Указ. тв. Т. 35. С. 412–439.
[5] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 8. Вильнюс, 1995. С. 125–128.
[6] Гл.: Historia dyplomacji Poiskej. Warszawa, 1982. S. 534.
[7] Гл.: Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32. С. 101, 172–173.
[8] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 8. Указ. тв. С. 51, 56.
[9] Гл.: Там жа. С. 84–85.
[10] Гл.: Там жа. С. 129.
[11] Гл.: Там жа. С. 64.
[12] Гл.: Jablonowski H. Westrussland zwischen Wilna und Moskau. Leiden, 1955. S. 99.
[13] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 8. Указ. тв. С. 120–121.

***Мікалаева Людміла Віктараўна*** – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, намеснік дэкана гістарычнага факультэта Ю.Л. Казакоў.

*А.Г. КАХАНОЎСКІ*

## САЦЫЯЛЬНАЯ СТРАТЫФІКАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА 60–90-х гг. XIX ст.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

Рэтраспектыўны гістарычны аналіз сацыяльнай стратыфікацыі грамадства (дыферэнцыяцыя, іерархія пэўных груп людзей на аснове няроўнасці размеркавання ўлады, уласнасці і прэстыжу) – шматпланавая навуковая праблема, пастаноўка якой у айчыннай гістарыяграфіі актуальная ў апошняе дзесяцігоддзе. Канкрэтныя формы сацыяльнай стратыфікацыі дастаткова шматлікія і розныя. Для беларускага грамадства 60–90-х гг. XIX ст. значным з'яўляецца вывучэнне саслоўнай, сацыяльна-прафесійнай, класавай, у пэўнай ступені культурна-нарматыўнай стратыфікацыйных сістэм, а таксама пытанняў сацыяльнай мабільнасці насельніцтва. Важнай навуковай задачай з'яўляецца таксама аналіз уплыву мадэрнізацыйных працэсаў на іерархію пэўных груп беларускага грамадства, вызначэнне сутнасці мадэрнізацыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., яе агульных і спецыфічных рыс.

У 60–90-х гг. XIX ст. насельніцтва Беларусі ўяўляла складанае перапляценне элементаў, характэрных для сацыяльнай структуры індустрыяльнага грамадства, і элементаў саслоўнай іерархіі мінулай эпохі. На працэс буржуазнай эвалюцыі структуры насельніцтва Беларусі стагніруючае ўздзеянне аказвала ўрадавая палітыка, асабліва абмежавальныя законы ў дачыненні



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

да яурэяу, католікау, замежных грамадзян і сялянства. У той жа час змены у сацыяльна-эканамічным аблічча Беларусі (таварызацыя сельскай гаспадаркі, развіццё фабрычна-заводскай прамысловасці і г. д.) прычыніліся да адпаведных перамен у складзе, сацыяльнай мабільнасці і стратыфікацыі насельніцтва – фарміраванні сацыяльных груп індустрыяльнага грамадства, інтэнсіфікацыі урбанізацыйных працэсау і г. д.

Вывучэнне сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства 60–90-х гг. XIX ст. яшчэ не стала прадметам спецыяльнага даследавання, але некаторыя аспекты гэтай тэмы знайшлі асвятленне у працах па сацыяльна-эканамічнай, палітычнай гісторыі Беларусі. Першыя спробы распрацоукі пытанняу, блізкіх да вызначанай праблемы, звязаны з аналізам названых працэсау навукоуцамі канца XIX – пачатку XX ст. У іх публікацыях адлюстраваны характарыстыка эканамічнага становішча, эвалюцыя пралетарыяту, сялянства, дваранства і г. д. У большай частцы работ беларускія губерні разгледжаны у агульнарасійскім кантэксце[1], некаторыя прысвечаны канкрэтна беларускай праблематыцы[2]. Для сучасных даследчыкау гэтыя працы з'яуляюцца своеасаблівымі крыніцамі, паколькі уключаюць каштоуныя заувагі, вялікі эмпірычны матэрыял па разглядаемай тэме.

У 20–30-х гг. XX ст. з'явіуся шэраг работ, прысвечаных гісторыі рабочага класа, сялянства, эвалюцыі капіталістычных адносін на Беларусі – гэты перыяд у вывучэнні тэмы вызначауся кантрастамі, празмерным эканамічным дэтэрмінізмам, ідэалагічнымі штампамі. З'явіліся таксама і каштоуныя даследаванні, звязаныя ускосна з разглядаемай тэмай, найбольш сур'ёзным з якіх стала манаграфія М.В. Доунар-Запольскага “Народное хозяйство в Белоруссии. 1861–1914 гг.”[3] У гэтай кнізе распрацаваны пытанні саслоунага складу насельніцтва Беларусі, сацыяльнай дыферэнцыяцыі, эканамічнага становішча сельскіх жыхароу, пралетарыяту, зроблены вывад аб пачатку капіталістычнай мадэрнізацыі Беларусі, які, па меркаванню аутара, звязаны з 80-мі гг. XIX ст.[4] Коратка ахарактарызавау сацыяльны склад насельніцтва Беларусі у канцы XIX ст. У. Ігнатоускі у шэрагу сваіх навуковых прац[5]. Першай спробай аналізу з марксісцкіх пазіцый сацыяльнага развіцця Беларусі у другой палове XIX ст. стала даследаванне Д.А. Дудкова[6].

У пасляваенны перыяд, асабліва пачынаючы з канца 50-х гг. XX ст., пашыраецца кола пытанняу сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства другой паловы XIX ст., разгледжаных беларускімі гісторыкамі, больш грунтоуным і усебаковым становіцца іх аналіз. На гэтым этапе выходзіць шэраг прац К.І. Шабуні, прысвечаных аграрнай гісторыі[7], у якіх прааналізаваны пытанні стратыфікацыі сялянства і землеуласнікау ва умовах эвалюцыі буржуазных адносін. Некаторыя аспекты гэтай праблемы змешчаны у манаграфіях І.і. Саладкова, М.Б. Фрыдман, А.І. Кажушкова, Л.П. Ліпінскага[8]. Адыходніцтва сялян, уплыу урадавых мерапрыемствау у сферы землеуладання і землекарыстання на развіццё сацыяльнай структуры сельскага насельніцтва, іерархія землеуласнікау паводле велічыні уладанняу і некаторыя іншыя сумежныя пытанні грунтоуна даследаваны у працах В.П. Панюціча[9]. Для пералічаных манаграфій характэрны агульны падыход пры разглядзе сацыяльнай іерархіі сельскага насельніцтва. Стратыфікацыя сялянства айчыннымі гісторыкамі традыцыйна праводзілася на аснове групоукі сялянскіх гаспадарак на падставе колькасці коней, якія належалі гаспадарцы, і па велічыні ворыунай зямлі. Крытэрыямі такога іерархічнага ранжыравання сялянства былі наступныя: уладальнікі гаспадарак без коней і з адным канём адносіліся да ліку бедных; з двума коньмі – да сярэдніх, з трыма і больш – да заможных; гаспадары з колькасцю ворыунай зямлі да чатырох дзесяцін – да бедных, звыш васьмі дзесяцін – да заможных, астатнія – да сераднякоу. На аснове праведзенай такім чынам групоукі быу зроблены вывад аб тым, што на мяжы XIX–XX ст. бяднейшы слой сялянства складау звыш 60 %, сярэдні –



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

каля 30 %, багацейшы – каля 8–10 %. Амаль палова прадстаўнікоў апошняй названай групы распараджалася зямельнымі уладаннямі памерам звыш 100 гектараў і па велічыні гаспадарак уздымалася да ўзроўню памешчыкаў. Аднак названыя крытэрыі і зробленая на іх аснове стратыфікацыя небездакорныя. Пад ціскам нарастаючага к канцу XIX ст. беззямелля, вострай ва ўмовах Беларусі аграрнай перанаселенасці сялянства вымушана было шукаць дадатковыя заробкі па-за межамі сваёй гаспадаркі, вёскі, адыходзіць на промыслы і г. д. Амаль палова сялян значную частку даходаў атрымлівала не праз сельскагаспадарчыя заняткі. У сувязі з гэтым больш аб'ектыўным з'яўляецца вызначэнне маёмаснай іерархіі сялянства праз улік агульнага даходу ў сялянскай гаспадарцы на душу насельніцтва. Але рэпрэзентатыўныя дадзеныя аб сукупных даходах вясковых жыхароў адсутнічаюць.

На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў сярод даследчыкаў Савецкай Беларусі ў вывучэнні айчыннай гісторыі XIX ст. адной з найбольш актуальных тэм была гісторыя рабочага класа, якую даследаваў З.Е. Абезгауз у манаграфіі "Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века"[10], дзе прыводзіцца шматлікі эмпірычны матэрыял аб сацыяльнай мабільнасці пралетарыяту і становішчы розных груп рабочых.

У працах М.В. Біча дадзены больш дэталёвы разгляд дынамікі колькасці, складу, становішча, крыніц фарміравання пралетарыяту, а таксама кароткая характарыстыка саслоўнага і сацыяльна-прафесійнага складу насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст., аналіз працэсаў кансалідацыі сацыяльных груп пралетарыяту і буржуазіі[11]. Грунтоўнасцю вызначаецца манаграфія М.Ф. Болбаса "Промышленность Белоруссии. 1860–1900" (Мінск, 1978), у якой разгледжаны сацыяльны склад пралетарыяту і пакладзены пачатак вывучэнню прамысловай буржуазіі Беларусі. Адметнай рысай працы з'яўляецца і прывядзенне лічбавых дадзеных не ў межах пяці беларускіх губерняў ці 35 паветаў, як гэта было ў іншых даследаваннях, а іх вызначэнне па тэрыторыі Беларусі ў сучасных межах. Значную навуковую каштоўнасць маюць таксама і табліцы, змешчаныя ў дадатку да манаграфіі.

Асобныя пытанні сацыяльнай мабільнасці і стратыфікацыі рабочых знайшлі адлюстраванне ў працах А.С. Бараноўскага, В.М. іванова, У.А. Цітка і інш.[12] Этапным падвядзеннем вынікаў даследаванняў савецкімі вучонымі гісторыі рабочага класа Беларусі стала публікацыя чатырохтомнага выдання "История рабочего класса Белорусской ССР", у першым томе якога змешчаны матэрыялы аб фарміраванні, колькасці, складзе, становішчы пралетарыяту Беларусі ў другой палове XIX ст.[13]

Саслоўная урадавая палітыка ў другой палове XIX ст., рэжым выключных законаў у дачыненні да католікаў, яўрэяў у сферы землеўладання і землекарыстання, іх уплыў на сацыяльныя працэсы ў горадзе і вёсцы Беларусі прааналізаваны ў манаграфіі С.М. Самбук "Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века" (Мн., 1980). Асобныя фрагменты стратыфікацыйных працэсаў на Беларусі разгледжаны ў некаторых працах М.М. Улашчыка, З.Я. Тальвірскай, П.Д. Верашчагіна, Х.Ю. Бейлькіна і інш.[14]

У апошняе дзесяцігоддзе сярод айчынных даследчыкаў, якія пераважна звяртаюць увагу на вывучэнне гісторыі дваранства, буржуазіі, чыноўніцтва, святарства, інтэлігенцыі Беларусі, асаблівай увагі заслугоўваюць працы А.П. Жытко, З.В. Шыбекі і інш.[15] У манаграфіі З.В. Шыбекі "Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў)" на аснове метадаў матэматычнай статыстыкі вызначана месца гараджан у структуры насельніцтва Беларусі. Асаблівую цікавасць у наш час да новай тэматыкі праявілі маладыя даследчыкі[16]. Традыцыйныя сюжэты, звязаныя з разглядам сацыяльных працэсаў і структуры сялянства, рабочага класа, землеўласнікаў адышлі на другі план, аднак сацыяльна-культурнае становішча, стратыфікацыя сялянства, прале-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

тарыяту Беларусі патрабуюць сваёй канкрэтызацыі і дадатковага разгляду. Увагай беларускіх вучоных абыдзена прадметнае вывучэнне сутнасці і асаблівасцей мадэрнізацыйных працэсаў на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст., пад уплывам якіх адбывалася эвалюцыя сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства. Некаторыя змены ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці Беларусі пад уплывам развіцця капіталістычных адносін, урбанізацыя, што разам з іншым складаюць змест мадэрнізацыі Беларусі, прааналізаваны ў названых вышэй працах М.В. Біча, М.Ф. Болбаса, В.П. Панюціча, З.В. Шыбекі і інш.

Цікавыя дадзеныя і характарыстыка сацыяльных працэсаў у беларускіх губернях прыведзены ў працах расійскіх даследчыкаў, якія ахопліваюць больш шырокія па тэрытарыяльнаму ахопу аспекты вывучэння тэмы. Сярод іх вылучаюцца працы А.М. Анфімава, Л.і. Бародкіна, М.М. Дружыніна, А.П. Карэліна, і.Д. Кавальчанкі, В.Р. Лейкінай-Свірскай, Б.М. Міронава, П.Р. Рындзюнскага і інш.[17] Звярталіся да асобных фрагментаў сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства 60–90-х гг. XIX ст. таксама некаторыя польскія, нямецкія і іншыя даследчыкі, але разгляд прац замежных вучоных можа стаць тэмай асобнага даследавання.

[1] Абрамович К. О крестьянских сервитутах в губерниях Западных, Прибалтийских и Царстве Польском. СПб., 1895; Варб Е. Наемные сельскохозяйственные рабочие в жизни и законодательстве. М., 1899; Кадомцев Б.П. Профессиональный и социальный состав населения Европейской России по данным переписи 1897 г. СПб., 1909; Погожев А. Учет численности и состава рабочих в России. СПб., 1906.

[2] Вульферт И.К. Очерк развития фабрично-заводской промышленности в Виленской губернии. Вильно, 1899; Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях: В 3 кн. Могилев, 1882–1884; Россия. Полное географическое описание нашего отечества / Под ред. В.П. Семенова. Т. 9: Верхнее Поднепровье и Белоруссия. СПб., 1905.

[3] Довнар-Запольский М.В. Народное хозяйство Белоруссии. 1861–1914 гг. Мн., 1926.

[4] Там жа. С. 232.

[5] Игнатовский В. Белоруссия. Территория, население, экономика, важнейшие моменты истории. Мн., 1924; Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX стагоддзя. Мн., 1928.

[6] Дудкоў Д.А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-ой палове XIX і пачатку XX стагоддзя. Мн., 1932.

[7] Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. Мн., 1962; Ён жа. О некоторых чертах развития аграрных отношений в Белоруссии во второй половине XIX – начале XX в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1960 г. Киев, 1962; Ён жа. О развитии капитализма в помещичьем хозяйстве Белоруссии в конце XIX и начале XX в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1961 г. Рига, 1963.

[8] Саладков И.И. Социально-экономическое положение Белоруссии до Великой Октябрьской социалистической революции (конец XIX – начало XX в.). Мн., 1957; Фридман М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958; Кожушков А.И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1963; Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.). Мн., 1971.

[9] Панютич В.П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии. 1861–1914 гг. Мн., 1969; Ён жа. Помещичье зхемлевладение в Белоруссии во второй половине XIX в. // Проблемы аграрной истории: В 2 ч. Ч. 2: XIX – 30-е годы XX в. Мн., 1978; Ён жа. К вопросу о поземельной политике царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. // Из истории крестьянства Белоруссии: Сборник статей по материалам первой сессии республиканского симпозиума по истории сельского хозяйства и крестьянства Белоруссии. Декабрь 1975. Мн., 1978; Ён жа. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990; Ён жа. Наемный труд в сельском хозяйстве Белоруссии 1861–1914 гг. Мн., 1996.

[10] Абезгауз З.Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1971.

[11] Бич М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии. 1883–1903. Мн., 1973; Ён жа. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. Мн., 1983; Ён жа. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX–пачатку XX ст. // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1972. № 4.

[12] Бараноўскі А.С. Дэмаграфічная характарыстыка рабочых Гомельскіх майстэрань Любава-Роменскай чыгункі (канец XIX–пачатак XX ст.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1973. № 4; Иванов В.М. Очерк быта промышленных рабочих дореволюционной Белорус-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

сии. Мн., 1971; Титок В.А. Формирование и революционная борьба железнодорожного пролетариата Белоруссии во второй половине XIX – начале XX в.: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1966.

[13] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4 т. Т. 1: Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. Мн., 1984.

[14] Улащик Н.Н. Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. 1968. № 1; Тальвирская З.Я. К вопросу о социальном облике мелкого дворянства в 1860-х годах (по материалам трех уездов Минской губ.) // Историко-социологические исследования. М., 1970; Верещагин П.Д. Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.). Мн., 1978; Бейлькин Х.Ю. Рост торгового земледелия в Белоруссии в 80–90-е гг. XIX в. // Вопросы истории. Мн., 1976. Вып. 3; Ён жа. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1861–1914 гг. Мн., 1989; Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Мн., 1985; Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. Мн., 1993; Крук У.П. Сялянскі рух на Беларусі. Мн., 1993; Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. Мн., 1990.

[15] Шыбека З.В. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў). Мн., 1997; Ён жа. Сацыяльнае размежаванне беларусаў у канцы XIX ст. // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1991. № 6; Жытко А. Палітыка царызму ў адносінах да дваран-католікаў Беларусі. 1861–1914 гг. // XX стагоддзе у гісторыі палякаў і беларусаў: Матэрыялы беларуска-польскай навуковай канферэнцыі, Мінск, 20–21 лістапада 2000 г. Мн., 2001; Каханоўскі А.Г. Дваранства Беларусі ў другой палове XIX ст.: склад і сацыяльнае аблічча // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя: новыя канцэпцыі і падыходы: У 2 ч. Ч. 1: Гісторыя Беларусі. Мн., 1994; Ён жа. Саслоуная і сацыяльна-прафесійная стратыфікацыя беларускага грамадства у 60–90-ых гг. XIX ст. // Выбраныя навуковыя працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта: У 7 т. Т. 2: Гісторыя. Філасофія. Журналістыка. Мн., 2001.

[16] Роцька Н.А. Чыноўніцкі апарат на Беларусі (1863 г. – канец 70-х гг. XIX ст.) // Гістарычная навука у Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяу. Мн., 2000; Лобков А.А. Изучение социальных процессов в Беларуси конца XIX в. на основании данных первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 г. // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяу. Мн., 2000.

[17] Анфимов А.М. Крупное помещичье хозяйство Европейской России. М., 1969; Корелин А.П. Дворянство в пореформенной России. 1861–1904 гг. Состав, численность, корпоративная организация. М., 1979; Ковальченко И.Д., Бородкин Л.И. Аграрная типология губерний Европейской России на рубеже XIX–XX вв. (Опыт многомерного количественного анализа) // История СССР. 1979. № 1; Яны ж. Промышленная типология губерний Европейской России на рубеже XIX–XX вв. (Опыт многомерного количественного анализа по данным промышленной переписи 1900 г.) // Математические методы в социально-экономических и археологических исследованиях. М., 1981; Лейкина-Свирская В.Р. Интеллигенция в России во второй половине XIX века. М., 1971; Рындзюнский П.Г. Крестьяне и город в капиталистической России второй половины XIX века. М., 1983; Миронов Б.Н. Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.): В 2 ч. СПб., 1999.

***Каханоўскі Аляксандр Генадзьевіч*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу.

*В.Н. ТЕМУШЕВ*

## ОПРЕДЕЛЕНИЕ ТЕРРИТОРИИ И ГРАНИЦ СРЕДНЕВЕКОВОГО ГОСУДАРСТВА (на примере Московского княжества конца XIII – середины XIV в.)

Историческая география и, в частности, ее раздел историческая политическая география – не часто привлекали внимание исследователей. Выяснение же динамики территориальных изменений в составе государственных образований прошлого, конкретизация пространственного размещения древних княжеств и земель, определение границ территорий позволяют поновому с большей долей объективности взглянуть на политические и социально-экономические процессы, проходившие в изучаемых регионах.

Связь географического положения с политическими тенденциями, вознесшими Москву во главу русских земель, несомненна. Из маленького, зажатого между сильными соседями княжества во многом благодаря неудовлетворенности своими территориальными пределами Москва развилась и выросла в сильнейшее государство Восточной Европы. Именно удобное расположение Московского княжества позволило ему нарастить экономическую мощь, необходимую для борьбы за верховенство в Северо-Восточной Руси. Первые московские князья заложили основы московского могущества,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm